Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

21 ЛІПЕНЯ 2022 г. ЧАЦВЕР № 141 (29763)

ЗА ПАРОГАМ АДЭКВАТНАСЦІ 5

ПЕСНІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ 13

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір ГРАКУН, намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання:

«Ураджай цукровых буракоў у 2021 годзе ў дастатку забяспечыў вытворчасць цукру для ўнутранага рынку, таму яго запасаў у краіне сёння больш чым дастаткова — на гэты момант больш як 111 тысяч тон знаходзіцца на складах. Для разумення: у ліпені-жніўні насельніцтва купляе каля 20—25 тысяч тон у месяц. Так што запасаў несумненна хопіць да новага ўраджаю, які ўжо не за гарамі — праз паўтара месяца. Сёлета плошчы пад цукровыя буракі павялічаны. Чаканы ўраджай цукровых буракоў — не менш як 5 млн тон. Гэтага цалкам дастаткова для таго, каб забяспечыць сваё насельніцтва і мець экспартны патэнцыял».

Дзве сястры, дзве ракі

Валянціна ДЗЯДКОВА і Таццяна СІДАРЭНКАВА — родныя сёстры. Іхняя малая радзіма — вёска Понар Хіславіцкага раёна Смаленскай вобласці Расіі, знаходзіцца на мяжы з Беларуссю — з Мсціслаўскім раёнам. Непадалёк ад вёскі зліваюцца дзве ракі — Віхра і Сож, якія пачынаюцца на тэрыторыі краіны-суседкі і працягваюць свой шлях па нашай краіне. Нячаста даводзіцца сустракацца сёстрам, бо яны даўно пакінулі бацькоўскі кут і жывуць цяпер у розных гарадах: Валянціна — у Смаленску, а малодшая Таццяна — у Магілёве. Валянціна Уладзіміраўна раней працавала бухгалтарам, а Таццяна Уладзіміраўна і цяпер працуе ў медыцыне — лабарантам у паліклініцы. Нягледзячы на тое, што яны абедзве пенсіянеркі, усё роўна не сядзіцца ім у гарадах, едуць пабачыць родныя мясціны, каб адпачыць душою, пабыць на сожскім беразе, сустрэцца з роднымі сёстрамі і братам — шэсць дзяцей было ў сям'і. Ад вёскі Понар (якая ўжо дажывае свой век) да найбліжэйшага беларускага населенага пункта, вёскі Парадзіна ўсяго чатыры кіламетры. Сёстры ўспамінаюць, як у дзяцінстве і маладосці хадзілі туды ў краму, у клуб на вечарынкі, а суседскія хлопчыкі і дзяўчынкі вучыліся ў парадзінскай школе. І цяпер менавіта праз вёску Парадзіна — найбліжэйшым шляхам, Таццяна трапляе на сваю радзіму. Сёстры радуюцца, што тут не існуе граніцы, якая дзеліць людзей на «вашых і нашых». А гэты здымак зроблены якраз у тым славутым месцы, дзе зліваюцца рэкі, дзе былі вясковыя сенакосныя лугі, дзе ўволю загаралі ды купаліся.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КАРАТКА

- «Беларусьфільм» выпусціць анімацыйны фільм пра Купалу і Коласа да Дня беларускага пісьменства.
- **Мінпрыроды: штогод у Беларусі знішчаецца 900 га баршчэўніку Сасноўскага.**
- Міні-копіі кніг Беларусі перададуць у экспазіцыю і фонды Александрыйскай бібліятэкі ў Егіпце.
- **Рэзідэнт СЭЗ «Віцебск» асвоіў выпуск тэст-сістэмы для адначасовага выяўлення дзевяці інфекцый на фоне COVID.**
- У РНПЦ «Маці і дзіця» маладой жанчыне выканалі ўнікальную аперацыю пры рэдкім прыроджаным пароку.

ДАБРАЧЫННЫЯ ЗАБЕГІ, ЗДАРОВАЕ ХАРЧАВАННЕ, СПАРТЫЎНЫ КВЭСТ

VYTOKI

Усё гэта і шмат іншага запланавана ў праграме спартыўна-культурнага фестывалю «Вытокі. Крок да Алімпу», які ўжо заўтра завітае ў Горкі

Горкі — горад асаблівы. Тут ў XIX стагоддзі быў адкрыты першы ў Расійскай імперыі земляробчы інстытут. А ў 2014 годзе раённы цэнтр стаў першым населеным пунктам у Магілёўскай вобласці, дзе прапісаўся праект «Горкі — здаровы горад». На сёння ён адзіны з Беларусі ўваходзіць у сетку Сусветнай арганізацыі аховы здароўя «Здаровыя гарады». У Год гістарычнай памяці Горкі, як і любы іншы горад, які ўдзельнічае ў культурна-спартыўным фестывалі «Вытокі», робіць акцэнт на культурнай спадчыне, беларускіх брэндах, творчых майстар-класах, спартыўных конкурсах. І яму ёсць што паказаць і пра што расказаць. «Вытокі» будуць гасцяваць у Горках два дні — 22 і 23 ліпеня. Першы цалкам прысвечаны вывучэнню патэнцыялу раёна.

СТАР. 3

Адукацыя

УНІВЕРСІТЭЦКІ БРЭНД З ГОРАДА НАД СОЖАМ

У пачатку тыдня ў краіне стартавала прыёмная кампанія ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Больш за 60 тысяч былых школьнікаў прайшло цэнтралізаванае тэсціраванне і цяпер прымяраюць на сябе статус абітурыента. Сёлета ў краіне на ўзровень вышэйшай адукацыі плануюць прыняць каля 53 тысяч чалавек. Амаль 28 тысяч — зможа вучыцца на бюджэце. Чым вабіць сёння абітурыентаў каманда «скарынаўцаў», каго рыхтуе, загартоўвае вучобай і навуковай дзейнасцю знакамітая гомельская альма-матэр, — у інтэрв'ю з рэктарам ГДУ імя Ф. Скарыны Сяргеем ХАХОМАВЫМ.

— Сёння Гомельскі дзяржуніверсітэт у міжнародным рэйтынгу ўстаноў вышэйшай адукацыі Webometrics займае 3 месца сярод беларускіх ВНУ і 1-е сярод рэгіянальных устаноў вышэйшай адукацыі. У сусветным рэйтынгу — уваходзіць у 10 працэнтаў найлепшых устаноў адукацыі. У снежні мінулага года ГДУ імя Ф. Скарыны ўвайшоў у спіс найлепшых універсітэтаў краін Еўропы і Цэнтральнай Азіі QS EECA. Між тым, ва ўніверсітэта як прамога прадаўжальніка дзейнасці Гомельскага педагагічнага інстытута — найбагацейшая, амаль паўвекавая, гісторыя. Сяргей Анатолевіч, ГДУ імя Ф. Скарыны сёння — гэта...

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

Блізкая ўлада

З ПРАБЛЕМАЙ САМ-НАСАМ НЕ ПАКІНУЦЬ

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА 20 ліпеня правяла асабісты прыём грамадзян

Людзі прыходзілі на прыём з самымі рознымі пытаннямі, якія не змаглі вырашыць падчас зваротаў у іншыя інстанцыі. Сярод іх — вырашэнне канфліктаў на рабочым месцы, будаўніцтва на ўласным зямельным участку, арганізацыя бесперапынных паставак вырабаў медыцынскага прызначэння і медыцынскай тэхнікі, добраўпарадкаванне жылых кварталаў і шмат іншых.

Некаторыя з праблем вырашаліся адразу на месцы: падчас размовы з грамадзянамі Наталля Качанава падкрэсліла, што запрашаць на сустрэчы трэба не толькі «пацярпелых», але і тых, хто за гэта адказны. У некаторых выпадках адразу пасля знаёмства з сітуацыяй Старшыня Савета Рэспублікі давала распараджэнне: тэлефанаваць адказным і выклікаць іх для неадкладнага вырашэння праблемы.

Як адзначыла **Кацярына РЭЧЫЦ, кіраўнік інфармацыйна-аналітычнага ўпраўлення сакратарыята Савета Рэспублікі,** работа з насельніцтвам з'яўляецца прыярытэтным напрамкам у дзейнасці Савета Рэспублікі:

— Работа вядзецца бесперапынна, нягледзячы на міжсезонны перыяд. Жадаючых трапіць на прыём вельмі шмат, усе дні, калі вёўся запіс, тэлефон не змаўкаў. Нягледзячы на тое, што прыём адбываецца ў Мінску, грамадзяне прыязджаюць практычна з усіх куткоў нашай краіны. У насельніцтва пытанні самага рознага кшталту, у першую чаргу яны звязаныя з якасцю іх жыцця: жыллёва-камунальная гаспадарка, транспартная сувязь, уладкаванне дзяцей у садкі і школы, працоўная дзейнасць. Былі разгледжаны і пытанні, якія датычацца дзейнасці прадпрыемстваў, садаводчых таварыстваў і сельсаветаў. Хацела б звярнуць увагу на тое, што з кожным разам больш актыўнымі становяцца нашы патрыятычныя арганізацыі — іх прадстаўнікі з'яўляюцца практычна на кожным прыёме, уносячы слушныя прапановы, якія будуць улічаны пры ўдасканаленні заканадаўства. Грамадзяне, што звярнуліся да нас, упэўненыя ў тым, што іх не толькі выслухаюць, але і ўнікнуць у іх праблему.

Больш падрабязна аб праблемах, з якімі грамадзяне звярнуліся да Наталлі Качанавай, мы распавядзём у наступным нумары «Мясцовага самакіравання».

Арына КАРПОВІЧ.

Жніво-2022

САБРАЦЬ ДА АПОШНЯГА ЗЯРНЯТКА

Паводле даных Мінсельгасхарча, на 20 ліпеня па краіне ўбрана больш за 59 тысяч гектараў збожжавых і зернебабовых культур (акрамя кукурузы, грэчкі і проса), што складае менш за тры працэнты ад агульнай колькасці ўборачных плошчаў. У лідарах — Брэсцкая, якая традыцыйна раней за іншыя рэгіёны пачынае жніво. Паўночныя рэгіёны толькі стартуюць, Віцебская і Магілёўская вобласці ўбралі менш за адзін працэнт ад сваіх плошчаў. Збожжа там яшчэ спее. Масавай лічыцца ўборка, калі ўраджай ужо вывезены з пяці працэнтаў палёў. Пакуль рана казаць пра ўраджайнасць збожжавых, але традыцыйна самы ўраджайны рэгіён — Гродзенскі. Цяпер там атрымліваюць каля 60 цэнтнераў з гектара, паведаміў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір ГРАКУН на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры. Асобныя гаспадаркі маюць да 100 цэнтнераў з гектара.

УРАДЖАЙНАСЦЬ АЗІМАГА ЯЧМЕНЮ РАДУЕ

«Пачалася ўборка збожжавых і крыжакветных культур. Убрана 75 працэнтаў азімага ячменю, ураджайнасць нас радуе — больш за 50 цэнтнераў з гектара, — прывёў лічбы на 19 ліпеня Уладзімір Гракун. — У цэлым нам трэба ўбраць 2,5 мільёна гектараў збожжавых і зернебабовых культур разам з кукурузай на зерне. Ураджай збожжа чакаецца ў аб'ёме звыш дзевяці мільёнаў тон (з кукурузай). Больш за 800 тысяч тон чакаем намалот крыжакветных. Цяпер ідзе ўборка азімага рапсу, азімай свірэпіцы. Мы павінны ўбраць больш за 300 тысяч гектараў гэтых культур і яшчэ 60 тысяч яравога рапсу. На падыходзе азімыя жыта, пшаніца, трыцікале. 85 працэнтаў пасеваў знаходзіцца ў добрым стане. Пры гэтым плошчы збожжавых і зернебабовых большыя, чым летась».

Паводле яго слоў, ва ўборачнай кампаніі ў Беларусі будзе задзейнічана 7,5 тысячы збожжаўборачных камбайнаў, 237 з іх новыя, гатоўнасць тэхнікі складае больш за 93 працэнты. Сёлетняя сезонная патрэба ў механізатарах — 35 тысяч чалавек, маецца каля 32 тысяч, каля трох тысяч будуць набраныя з прамысловых прадпрыемстваў, навучальных устаноў, а таксама з іншых галін сельскай гаспадаркі. Дзяржзаказ складае больш як 800 тысяч тон зерня (пшаніца, жыта, ячмень). Прадстаўнік профільнага міністэрства не сумняваецца, што апошні будзе выкананы — у краіне будзе дастаткова харчовага збожжа, круп, таксама будзе забяспечана піваварная галіна і вытворчасць спірту.

Паралельна з уборкай збожжавых не спыняюцца работы і па іншых напрамках. Ідзе нарыхтоўка кармоў, церабленне лёну, уборка ранняй агародніны. Працягваецца клопат пра пасевы.

«Фарміруем ураджай цукровых буракоў, кукурузы, — заўважыў намеснік міністра. — Уборка збожжавых будзе пераходзіць у падрыхтоўку глебы для восеньскай сяўбы пад ураджай 2023 года».

Леташні ўраджай цукровых буракоў удосталь забяспечыў вытворчасць гэтага прадукту для ўнутранага рынку, адзначыў Уладзімір Гракун. Сёлета плошчы пад дадзеную культуру павялічаныя. Чаканы ўраджай цукровых буракоў — не менш як пяць мільёнаў тон. «Гэта цалкам дастаткова для таго, каб забяспечыць сваё насельніцтва і мець экспартны патэнцыял», — сказаў ён.

ВІЦЕБШЧЫНА СТАРТАВАЛА

На Віцебшчыне пакуль убрана ўсяго 200 гектараў, што складае 0,05 працэнта агульнай плошчы. Тут ураджай яшчэ фарміруецца — збожжа наліваецца.

Уборка азімага ячменю на поўначы краіны набірае тэмп. Як расказаў **начальнік упраўлення земляробства, раслінаводства і кормавытворчасці камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Віцебскага аблвыканкама Валерый НЯРОЗЯ,** у гэтыя дні мясцовыя аграрыі актыўна ўбіраюць азімую свірэпіцу — убрана ўжо палова з 7,8 тысячы гектараў, сярэдняя ўраджайнасць складае 6,9 цэнтнера з гектара.

Уборка рапсу пакуль не пачалася. Па словах **старшыні Віцебскага аблвыканкама Аляксандра СУБОЦІНА,** паўночны рэгіён плануе зайсці па намалоце за мільён тон збожжа і зрабіць паўтарагадовы запас кармоў. Гэта магчыма за кошт назапашаных угнаенняў, якіх сёлета ўнеслі ўдвая больш, і адладжанага тэхнічнага працэсу ўборкі.

НАДЗЕЯ НА ЗБОЖЖА

У паўднёвых раёнах Магілёўшчыны заканчваецца ўборка азімага ячменю, напарадзе — рапс.

Аднымі з першых прыбралі азімы ячмень у Магілёўскім раёне. Гэтую культуру тут высадзілі ўпершыню і засталіся задаволеныя вынікамі.

— Азімы ячмень быў пасеяны на плошчы 330 гектараў, яго ўраджайнасць склала 44 цэнтнеры з гектара, — адзначыў **першы намеснік старшыні Магілёўскага райвыканкама Генадзь ДАВЫДАЎ.** — Перавага дадзенай культуры ў тым, што яе рана ўбіраюць. За кошт гэтага зніжаецца нагрузка на камбайн.

Суразмоўнік звяртае ўвагу на тое, што азімы ячмень — добры папярэднік пад азімы рапс. Зерне само па сабе атрымалася нядрэннае, ураджайнасць таксама. Нехта плануе здаць сабранае на піваварэнне, таму што культура з нізкім утрыманнем бялку, нехта пакідае на корм, нехта — на насенне. У гаспадарак ёсць намер налета павялічыць пасяўныя плошчы.

Сёлета культура заняла 5516 гектараў па вобласці. На 19 ліпеня было прыбрана больш за 40 працэнтаў, намалочана восем тысяч тон збожжа пры ўраджайнасці 35,7 ц/га.

— У ліку першых уборку закончылі Асіповічы, Бабруйск, Быхаў, — адзначае **намеснік начальніка аддзела інтэнсіфікацыі раслінаводства камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Магілёўскага аблвыканкама Лілія ГУЛІНСКАЯ.** — А вось паўночныя раёны яшчэ не распачалі ўборку. Працягваецца нарыхтоўка свірэпіцы. Хутка пачнецца ўборка рапсу. Пакуль ім спрабуе займацца толькі Бабруйскі раён.

Спецыялісты кажуць, што азімы рапс перазімаваў дрэнна, моцна пацярпеў ад вясновых замаразкаў.

— Па Магілёўшчыне наогул рапс не атрымаўся, — пацвярджае Генадзь Давыдаў. — Зімоўка дрэнна адбілася на культуры. Пасевы зрэджаныя, месцамі аслабленыя. Халодная восень, «цягучая» вясна зрабілі сваю справу. У каго рапс прапаў з вясны, перасявалі яравым, і пакуль разлікі на ўраджай нядрэнныя. Па ўтрыманні алею ён крыху ніжэйшы, чым азімы, але не крытычна. З рапсу вырабляецца шрот на корм жывёле, харчовы алей і тэхнічнае масла. Культура вельмі каштоўная, ніякая іншая яе не заменіць. Таму Прэзідэнт і звяртае ўвагу на тое, каб прыбраць рапс да адзінага зярнятка. Цана яго высокая, попыт ёсць.

У Магілёўскім раёне да паносу рапсу і азімай пшаніцы, якая паспявае раней, чым іншыя культуры, падыходзяць на наступным тыдні.

— Пасевы разнашэрсныя, ёсць так сабе і вельмі добрыя. Азімых збожжавых чакаецца добры ўраджай, а вось яравыя ўрадзілі парознаму — ёсць і горш, і лепш, — дае ацэнку суразмоўнік.

Масавую ўборачную ў раёне распачнуць у канцы месяца.

— Рамонт камбайнаў зрабілі, комплексы сушыльныя гатовыя да прыёмкі ўраджаю, — рэзюмуе Генадзь Давыдаў. — Звыш 100 збожжаўборачных камбайнаў будзе задзейнічана ў рабоце. Збор ураджаю — работа сезонная, таму прыцягваем кіроўцаў са старонніх арганізацый. Гэта работнікі «Зелянбуда», лясгаса — усе вакансіі камбайнераў закрытыя. У якасці падсобных рабочых будуць выкарыстаны ўнутраныя рэзервы.

На мінулым тыдні ў Магілёўскім аблвыканкаме з удзелам міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Ігара Брыло абмеркавалі гатоўнасць сельгасарганізацый да ўборачнай. На пасяджэнні агучвалася, што сёлетні валавы збор збожжавых і зернебабовых з улікам кукурузы чакаецца на Магілёўшчыне ў аб'ёме 1312 тысяч тон. Для параўнання, летась было 975 тысяч тон. Паводле інфармацыі камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Магілёўскага аблвыканкама, на ўборцы збожжа і азімага рапсу будзе задзейнічана 1045 камбайнаў. Пры спрыяльных умовах надвор'я ўборку плануецца правесці на працягу 18—20 дзён.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, Нэлі ЗІГУЛЯ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Раніл Вікрамасінгхэ абраны новым прэзідэнтам Шры-Ланкі



Новым кіраўніком краіны абраны дзеючы прэм'ер-міністр, які часова выконваў абавязкі прэзідэнта. Аб гэтым паведаміла газета «Известия». Раніл Вікрамасінгхэ стане восьмым прэзідэнтам Дэмакратычнай Сацыялістычнай Рэспублікі Шры-Ланка па выніках парламенцкага галасавання. 73-гадовы палітык атрымаў 134 галасы, яго найбліжэйшы апанент — колішні міністр па справах СМІ Дула Алахаперума — 82. Вікрамасінгхэ займаў пасаду прэм'ера краіны з мая гэтага года. Днямі ён стаў выконваючым абавязкі прэзідэнта Шры-Ланкі, пасля таго як на мінулым тыдні былы прэзідэнт краіны Гатабая Раджапакса накіраваў старшыні парламента афіцыйнае паведамленне аб адстаўцы са сваёй пасады. Як вядома, Шры-Ланка перажывае самы сур'ёзны эканамічны крызіс з 1948 года, калі краіна атрымала незалежнасць ад Вялікабрытаніі.

Інфляцыя ў еўразоне ў чэрвені дасягнула рэкордных 8,6 працэнта

Аб гэтым сведчаць канчатковыя даныя статыстычнага ўпраўлення Еўрапейскага саюза. Паказчык з'яўляецца максімальным з пачатку разліку даных, калі еўра быў запушчаны ў абарачэнне. Інфляцыя ў еўразоне адчувальна паскорылася ў параўнанні з маем. Яна перавышае мэтавы паказчык Еўрапейскага цэнтральнага банка (ЕЦБ), які складае два працэнты, больш як у чатыры разы. Чарговае пасяджэнне ЕЦБ адбудзецца сёння, і ёсць верагоднасць, што па яго выніках ключавыя працэнтныя стаўкі будуць павышаны адразу на 50 базісных пунктаў, а не на чаканыя 25. Увогуле ў 27 краінах Еўрасаюза інфляцыя ў чэрвені паскорылася да 9,6 працэнта ў гадавым выражэнні з майскіх 8,8 працэнта. Найгоршыя паказчыкі ў дзяржавах Балтыі: у Эстоніі — 22 працэнты, Літве — 20,5 і Латвіі — 19,2 працэнта. Самая нізкая інфляцыя ў ЕС была зафіксавана на Мальце (6,1 працэнта), у Францыі (6,5 працэнта) і Фінляндыі (8,1 працэнта).

СААЗ заявіла аб уздыме новай хвалі кавіду ў Еўропе

У еўрапейскім рэгіёне назіраецца ўздым новай хвалі каранавіруса, якая выклікана распаўсюджваннем мутацый штама амікрон. Аб гэтым заявіў кіраўнік Еўрапейскага бюро СААЗ Ханс Клюге, паведаміла РІА «Навіны». Паводле яго слоў, цяпер найбольш распаўсюджаны ў Еўропе падвіды «Амікрона» ВА.2 і ВА.5. Яны дэманструюць высокую ступень кантагіёзнасці, калі параўноўваць з тымі штамамі, якія цыркулявалі ў мінулым. Клюге адзначыў, што за мінулыя паўтара месяца колькасць новых выпадкаў заражэння ў еўрапейскіх краінах узрасла ўтрая. Пры гэтым на мінулым тыдні на еўрапейскі рэгіён прыпала амаль палова ўсіх новых выпадкаў інфіцыравання ў свеце. Клюге прагназуе, што каранавірус стане больш актыўна перадавацца з надыходам халадоў. У сувязі з гэтым ужо цяпер неабходна павялічыць тэмпы вакцынацыі, а таксама прымаць санітарныя меры — па магчымасці насіць маскі і праветрываць памяшканні.

Дзень пісьменства

Запамінальны фестываль на добрушскай зямлі

Гатоўнасць святочных пляцовак, інфраструктуры, праграму мерапрыемстваў XXIX Дня беларускага пісьменства, які пройдзе ў Добрушы, абмеркавалі на пасяджэнні Нацыянальнага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні свята пад кіраўніцтвам старшыні аргкамітэта — намесніка прэм'ер-міністра Беларусі Ігара ПЕТРЫШЭНКІ.

Фота БелТА.

Віцэ-прэм'ер адзначыў, што Добруш быў абраны для правядзення Дня беларускага пісьменства па прапанове грамадскасці Гомельскай вобласці. «Гэта гістарычны горад. Яго нават называюць малой Венецыяй у Беларусі. 15 мастоў і пешаходных, і для транспартных зносін — гэта даволі шмат», — сказаў Ігар Петрышэнка.

Гаворачы аб падрыхтоўцы аб'ектаў да свята, намеснік прэм'ер-міністра адзначыў: «Яна яшчэ ў разгары».

У райцэнтры ідзе маштабнае абнаўленне інфраструктуры, будынкаў, збудаванняў. «Горад грунтоўна, мы бачым, прыгажэе на вачах. І абласныя ўлады, і рэспубліканскія (робяць многае. — **«Зв.»**) для таго, каб інфраструктура горада развівалася, ствараліся камфорт і ўтульнасць і людзям хацелася як мага даўжэй тут знаходзіцца, адвучыўшыся (моладзі. — **«Зв.»**), прыязджаць сюды», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Ігар Петрышэнка адзначыў, што два дні свята будуць напоўнены разнапланавымі, цікавымі падзеямі. «Мы правядзём знакавы, запамінальны XXIX Дзень беларускага пісьменства на добрушскай зямлі», — сказаў ён.

Так, адной з падзей стане ўрачыстае адкрыццё помніка Івану Пятровічу Шамякіну — ураджэнцу Добрушскага раёна. «Для нашай пісьменніцкай грамадскасці, Саюза пісьменнікаў Беларусі гэта вельмі важная, знакавая вяха», — звярнуў увагу віцэ-прэм'ер.

Знойдзе адлюстраванне ў праграме і 140-годдзе з дня нараджэння Якуба Коласа і Янкі Купалы, юбілейных дат іншых беларускіх пісьменнікаў.

Ігар Петрышэнка нагадаў, што 2022-і аб'яўлены ў Беларусі Годам гістарычнай памяці. «Нашы людзі ўдзячныя продкам, якія захавалі для нас мір, незалежнасць, забяспечылі паспяховае развіццё нашай суверэннай краіны. На свяце пройдзе ўрачыстая цырымонія ўскладання вянкоў і кветак да брацкай магілы, дзе пахаваны салдаты Чырвонай Арміі, якія склалі свае галовы, вызваляючы Добруш», — распавёў намеснік прэм'ер-міністра.

Па ўсім раёне кветкі лягуць і да помнікаў, пахаванняў ураджэнцаў добрушскай зямлі, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны — і мірных жыхароў, і тых, хто ваяваў у радах Чырвонай Арміі, у партызанах. «Цырымонія пройдзе адначасова на ўсіх брацкіх пахаваннях Добрушскага раёна», — удакладніў віцэ-прэм'ер. Паводле яго слоў, гэта будзе магутны жэст падзякі ад нашчадкаў тым, хто абараніў незалежнасць краіны.

Тэму захавання гістарычнай памяці працягне ваенная рэканструкцыя.

Належную ўвагу ў праграме аддадуць і спартыўнай тэматыцы. Частка падзей пройдзе на рэканструяваным стадыёне. Прыхільнікаў футбола збярэ фестываль памяці Уладзіміра Рыжанкова.

Маляўнічымі і запамінальнымі абяцаюць стаць цырыманіі адкрыцця і закрыцця Дня беларускага пісьменства. «Нашы артысты прадэманструюць як класічныя творы, так і новыя — у выкананні маладых артыстаў. А ў нас іх за апошні час з'явілася дастаткова. І мы ганарымся, што наша культура не стаіць на месцы, яна развіваецца», — падкрэсліў Ігар Петрышэнка.

На пасяджэнні абмеркавалі тэматычнае напаўненне святочных пляцовак, работу ўсіх задзейнічаных структур і арганізацый, у тым ліку грамадскага харчавання, медработнікаў, камунальных службаў, транспарту, а таксама аспекты арганізацыі грамадскай бяспекі.

«Мы павінны стварыць максімальны камфорт ва ўсіх сферах», — паставіў задачу Ігар Петрышэнка.

Паводле БелТА.

ДАБРАЧЫННЫЯ ЗАБЕГІ, ЗДАРОВАЕ ХАРЧАВАННЕ, СПАРТЫЎНЫ КВЭСТ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Здароўе — вялікая каштоўнасць, менавіта гэты пасыл быў закладзены ў абноўленую Канстытуцыю нашай краіны і нават змешчаны ў асобную норму, якая агаворвае, што ад самога чалавека залежыць, як ён захавае гэты скарб. У Горках пайшлі далей. Тут стварылі і працягваюць ствараць умовы для таго, каб чалавек быў здаровым, меў магчымасць займацца спортам і атрымліваў доступ да натуральных, карысных для нармальнай жыццядзейнасці прадуктаў. Другі складнік, якому надаецца не меншае значэнне, — патрыятычны. Грамадзянін краіны павінен ведаць гісторыю сваёй Радзімы і паважаць яе. З улікам гэтых акалічнасцяў складзены і маршрут прэс-туру па раёне.

— Старт фестывалю будзе пакладзены велапрабегам ад мемарыяла «Засмучаная маці» з сімвалічнай працягласцю 77 кіламетраў (па колькасці гадоў Вялікай Перамогі), — звяртае ўвагу **намеснік старшыні Горацкага райвыканкама Ларыса КРЫВІЦКАЯ.** — Гэта наша даніна павагі да тых, дзякуючы каму мы сёння жывём пад мірным небам. Удзельнікі велапрабегу зробяць прыпынак у аграгарадку Леніна, каб далучыцца да прэс-туру і наведаць Музей савецка-польскай баявой садружнасці. Тут жа, у Леніне, адбудзецца ўскладанне кветак. Пасля веласіпедысты працягнуць свой маршрут, а журналістаў чакае знаёмства са славутасцямі раёна.

Тут шмат цікавых турыстычных куточкаў, якія вабяць сваімі народнымі традыцыямі, сакральнай аўтэнтычнасцю. Зазірнуць у мінулае і ўбачыць, чым жылі продкі, дапаможа падарожжа на аграсядзібу «Мерэя», дзе знакаміты горацкі народны фальклорны калектыў «Паршынскія зоры» прэзентуе чароўны абрад «Зельніца».

— Гэта наша нематэрыяльная спадчына, — падкрэслівае суразмоўніца. — Абрад зусім нядаўна адроджаны, яго падрыхтавалі спецыяльна для фестывалю. Звязаны з нарыхтоўкай зёлак.

«Паршынскія зоры» — наогул асобная тэма для размовы. Калектыву ўласцівыя непаўторная манера выканання, у яго рэпертуары больш чым 200 адроджаных беларускіх песень.

Бясконца можна расказваць яшчэ пра адну жамчужыну Горацкага раёна — батанічны сад Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі. Ён таксама задзейнічаны ў праграме прэс-туру. Батанічны сад яшчэ ў XIX стагоддзі, калі акадэмія была Горы-горацкай земляробчай школай, ствараўся як навукова-даследчая лабараторыя для студэнтаў. Адным з галоўных яго дасягненняў з'яўляецца дэндрарый, які аб'яўлены батанічным помнікам прыроды рэспубліканскага значэння. У 2009 годзе батанічны сад акадэміі ўключаны ў Савет батанічных садоў Беларусі і Расіі.

Станоўчы імідж раёна фарміруе і адно з вядучых прадпрыемстваў — «Малочныя горкі». Тут выпускаюць звыш 60 найменняў прадукцыі. У рамках праекта «Горкі — здаровы горад» яно вырабляе асаблівую прадукцыю, разлічаную на спартсменаў і людзей, якія вядуць здаровы лад жыцця. З 2014 года распрацавана лінейка прадуктаў пад брэндам Exponenta. Яны асабліва карысныя пры павышаных фізічных нагрузках, а таксама пры знаходжанні ў экстрэмальных і экалагічна неспрыяльных умовах. Малочную прадукцыю Горак добра ведаюць у Расіі і Казахстане.

Семінар-практыкум «Актуальныя пытанні падрыхтоўкі спартсменаў і шляхі іх вырашэння», які пройдзе на базе акадэміі з удзелам спецыялістаў Вышэйшай школы трэнераў і спартыўных арганізацый Магілёўскай вобласці, істотна папоўніць веды пра алімпійскія каштоўнасці і дасягненні беларускіх атлетаў на галоўных стартах чатырохгоддзя.

Завершыцца першы фестывальны дзень канцэртам арганнай музыкі Валерыя Шмата.

Асноўныя мерапрыемствы свята, з удзелам вялікай колькасці людзей, адбудуцца на другі дзень. Месцам падзей стане Цэнтральная плошча і вуліца Якубоўскага ад Вакзальнай і да Сурганава. Фестывальныя пляцоўкі будуць мець амаль кіламетровую працягласць. Іх мантаж пачаўся ў сераду.

Тэма свята ў Горках — «Земляробчая школа». Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія — адна з найстарэйшых і найбуйнейшых шматпрофільных вышэйшых навучальных устаноў аграрнага напрамку сярод краін СНД і Еўропы, адлічвае час свайго існавання з 1840 года.

— Будзе арганізавана выстава, якая раскажа пра развіццё ўстановы ад моманту яе ўзнікнення, — удакладняе Ларыса Крывіцкая. — Гэта і развіццё тэхнікі, і архіўныя дакументы, і дасягненні. Будзе шмат цікавага — не стану загадзя раскрываць усе карты.

Аматары старых фота змогуць зрабіць на памяць здымак у стылі мінулых гадоў. Умоўная назва фотаатэльле — «Рэвалюцыйнае». Парадуюць Горкі і сваёй нацыянальнай кухняй. Сельсаветы, для якіх дэманстрацыя страў — першая справа, абяцаюць прыгатаваць нешта вельмі сімвалічнае і нават кароннае. Знойдзецца месца і для звыклых страў — юшкі, драных аладак, кашы. Тэрыторыя на карце свята пабазначана як прывал.

Федэрацыя лёгкай атлетыкі арганізуе забег на дыстанцыю звыш кіламетра па вуліцы Якубоўскага. Усе ўдзельнікі пасля забегу атрымаюць медалі. Удзел платны, але ўсе грошы пойдуць на лячэнне цяжкахворых дзяцей.

У фестывалі бяруць удзел вядучыя беларускія кампаніі па вырабе харчовай і прамысловай прадукцыі, прадпрыемствы легпрама прэзентуюць свае новыя калекцыі ў праекце «Роднае — моднае». Раёны Магілёўскай вобласці запросяць на свае падворкі, дзе будуць дэманстраваць самае адметнае і цікавае, што ў іх ёсць. Свае «фішкі» рыхтуе так званая адукацыйная пляцоўка. Прафтэхліцэі і каледжы вобласці прадэманструюць дасягненні па розных кірунках. Установы дашкольнай адукацыі запросяць да ўдзелу ў спартыўных праграмах. Рамеснікі зладзяць познавальныя майстар-класы.

Цэнтральнай падзеяй стане алімпійскі квэст, які пройдзе на Цэнтральнай плошчы. Там будуць працаваць 26 лакацый. Каб атрымаць падарунак ад НАК Беларусі, трэба будзе прайсці як мінімум 15 з іх.

Да паслуг наведвальнікаў — зона фудкортаў, сямейнага адпачынку, выстава-продаж «Беларускія брэнды». Будзе прадстаўлена перасоўная экспазіцыя Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, азнаямленчая пляцоўка Міністэрства надзвычайных сітуацый.

У праграме таксама конкурс маладых вакалістаў, канцэрт з удзелам папулярных артыстаў беларускай эстрады, які завершыцца феерверкам.

— Заўсёды прыемна прымаць такога ўзроўню мерапрыемствы, — кажа Ларыса Крывіцкая. — Гэта падштурхоўвае да яшчэ больш беражлівых адносін да роднага горада. У падрыхтоўцы задзейнічаны практычна ўсе службы. Наш горад спартыўны, маладзёжны і здаровы, напэўна, таму гэтае свята да нас і завітала. Папулярызацыя здаровага ладу жыцця ў нас заўсёды на першым плане, а «Вытокі» гэтаму садзейнічаюць.

Фестываль дае магчымасць пазнаёміцца бліжэй з асноўнымі відамі спорту, якія папулярызуюцца ў Беларусі, і стаўка робіцца перш за ўсё на дзяцей. Мэта — абудзіць іх цікавасць да таго ці іншага віду. У Горках працуе ДЮСШ па шасці відах спорту. І свята — нешта накшталт дня адчыненых дзвярэй, каб азнаёміцца з магчымасцямі спартыўнай установы.

— Горкі ганарацца вынікамі спартсменаў коннага аддзялення і аддзялення вольнай барацьбы, — звяртае ўвагу Ларыса Крывіцкая. — З выязных спаборніцтваў яны часта вяртаюцца з дыпломамі і кубкамі. Маладыя трэнеры актыўна рыхтуюць будучых зорак футбола. Наогул колькасць навучэнцаў, якія наведваюць дзіцяча-юнацкую спартыўную школу, толькі за год вырасла з 380 да амаль 500. Больш стала дзяцей на конным аддзяленні. З райцэнтраў Горкі адзіныя, дзе ёсць магчымасць займацца гэтым відам спорту. На фестывалі будзе лакацыя, дзе адбудзецца выступленне выхаванцаў гэтага аддзялення, а потым усе жадаючыя паспрабуюць сябе ў ролі коннікаў.

Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Горацкага райвыканкама Аляксандр Бяляцкі адзначае, што на свята прыедзе шмат майстроў з розных раёнаў. Будзе арганізавана выстава-продаж іх вырабаў і работа майстар-класаў.

— Мы пачалі рыхтавацца да такой адказнай місіі з пачатку года, — падкрэсліў суразмоўнік. — Рыхтавалі месцы правядзення фестывалю, займаліся добраўпарадкаваннем горада, аб'ектаў. Плануем з установамі адукацыі зрабіць выстаўку дасягненняў нашых пераможцаў і прызёраў. Будзе магчымасць пазнаёміцца з нашымі ўнікальнымі народнымі ўмельцамі, сярод іх народны майстар па лозапляценні Галіна Сцепанькова. Дзіцячая ўзорная студыя «Чарадзейка» прадэманструе дэфіле ў касцюмах з саломы. Усё пералічваць няма сэнсу. Лепш самім прыехаць і ўсё ўбачыць на свае вочы.

Пасля Горак фестываль «Вытокі» перамяшчаецца ў старадаўні Полацк (12—13 жніўня). Яго арганізатары — Нацыянальны алімпійскі камітэт, Федэрацыя прафсаюзаў, ТАА «АртХаос» і ТАА «БелБрэндАўдыт». Галоўная мэта праекта — раскрыццё патэнцыялу рэгіёна праз спорт, культуру, навуку і адукацыю.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

УНІВЕРСІТЭЦКІ БРЭНД З ГОРАДА НАД СОЖАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Гэта больш як сямітысячная каманда студэнтаў. Дастаткова салідны і калектыў супрацоўнікаў — звыш 1130 чалавек, у тым ліку звыш пяцісот чалавек — прафесарска-выкладчыцкі калектыў і навуковыя работнікі: дактары навук, прафесары, кандыдаты навук і дацэнты. Адзначу, што сярод нашых дактароў навук — пяць членаў-карэспандэнтаў НАН Беларусі — Аляксандр Рагачоў, Анатоль Сердзюкоў, Рыгор Ганчарэнка, Уладзімір Багінскі і Ігар Семчанка. Сёння ва ўніверсітэце на 11 факультэтах рыхтуюцца высокакваліфікаваныя спецыялісты па 41 спецыяльнасці I ступені і па 19 спецыяльнасцях II ступені вышэйшай адукацыі. Па амаль двух дзясятках спецыяльнасцяў рыхтуюцца магістранты і па больш як чатырох дзясятках спецыяльнасцяў — спецыялісты вышэйшай кваліфікацыі, па шасці спецыяльнасцях — дактаранты. Ва ўніверсітэце працуе 68 навукова-даследчых лабараторый, з якіх 47 — студэнцкія. Дзейнічаюць тры міжнародныя навукова-даследчыя лабараторыі, створаны тры спецыялізаваныя саветы па абароне дысертацый па чатырох спецыяльнасцях.

Рэктар ГДУ імя Ф. Скарыны Сяргей ХАХОМАЎ.

— Якія новыя спецыяльнасці адкрыты ва ўніверсітэце?

— Летась пачалася падрыхтоўка па спецыяльнасці «Прыкладная інфарматыка (праграмнае забеспячэнне камп'ютарных сістэм)», «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый (міжнародны турызм)», «Руская мова і літаратура. Замежная мова (англійская)» на дзённай форме адукацыі. Аднавіўся набор па спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (культурная спадчына і турызм)» на дзённай форме адукацыі. Таксама з мінулага года пачалася падрыхтоўка па спецыяльнасці «Камп'ютарная бяспека (радыёфізічныя метады і праграмна-тэхнічныя сродкі)», «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская)», «Руская мова і літаратура. Замежная мова (кітайская)» на дзённай форме адукацыі. Адзначу, што сёлета аднаўляецца набор на «Спартыўна-педагагічную дзейнасць (трэнерская работа па дзюдо)» і адкрываецца набор на «Спартыўна-педагагічную дзейнасць (трэнерская работа па баскетболе)». На новую спецыяльнасць — «Эканамічнае права» — плануецца пачаць набор студэнтаў з наступнага года.

— Якімі навуковымі дасягненнямі ганарацца «скарынаўцы»?

— Летась больш за палову ўсіх праведзеных у ГДУ навукова-даследчых работ мела прыкладны характар. Гэта і выкананне заданняў дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм, і заказаў прадпрыемстваў і арганізацый на аснове гаспадарчых дагавораў. Штогод навукоўцы ўніверсітэта даследуюць больш за 160 тэм — фундаментальных, прыкладных, навукова-метадычных. За апошнія гады выканана больш як 900 навукова-даследчых работ. Только за мінулы год выдадзена больш за 40 манаграфій, 12 падручнікаў, 36 зборнікаў. Сёлета ГДУ ў ліку першых сярод універсітэтаў краіны распрацаваў і зацвердзіў Палітыку ў галіне інтэлектуальнай уласнасці.

Запаветныя пасведчанні аб заканчэнні падрыхтоўчага аддзялення Інстытута дадатковай адукацыі ГДУ імя Ф. Скарыны атрымалі 13 замежных студэнтаў-выпускнікоў.

Ва ўніверсітэце таксама праводзіцца значная работа па развіцці інавацыйнай дзейнасці, камерцыялізацыі вынікаў навуковых даследаванняў і распрацовак, прыцягненні пазабюджэтных крыніц фінансавання. Заключаем дагаворы з прадпрыемствамі, замежныя кантракты, аказваем платныя паслугі.

— Як да інавацыйнай і навуковай дзейнасці заахвочваюцца студэнты?

— Цяпер ва ўніверсітэце працуе 47 студэнцкіх навуковых аб'яднанняў. Два гады таму мы ўпершыню правялі конкурс на найлепшую студэнцкую навукова-даследчую лабараторыю. Пераможцам стала лабараторыя «Альянс», якая была ўдастоена гранта спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Лабараторыя вытрымала высокую канкурэнцыю: усяго спецфондам былі выдзелены сродкі на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы толькі трох студэнцкіх навуковых аб'яднанняў з усёй краіны.

— Як ГДУ імя Ф. Скарыны развівае міжнародныя кантакты?

— Мы рэалізоўваем 175 міжнародных дагавораў з установамі вышэйшай адукацыі і арганізацыямі з 30 краін свету. Універсітэт з'яўляецца членам трох міжнародных сетак і асацыяцый. У 2017 годзе на базе нашага ўніверсітэта быў адкрыты першы ў Беларусі рэгіянальны Інстытут Канфуцыя, створаны сумесна з Нанкінскім універсітэтам навукі і тэхналогій. Праз год — пачаў работу і цэнтр навучання кітайскай мове. У 2019 годзе адкрыты Цэнтр вывучэння Беларусі пры Нанкінскім універсітэце навукі і тэхналогій. Сумесна з універсітэтам Шызуока (Японія) ажыццяўляецца праграма аспірантуры, якая прадугледжвае атрыманне вучонай ступені PhD у галіне фізікі і кандыдата фізіка-матэматычных навук. Дзейнічае і Дагавор аб рэалізацыі сумеснай адукацыйнай праграмы «Нанаматэрыялы ў мікрасістэмнай тэхніцы» паміж ГДУ імя Ф. Скарыны і Нацыянальным даследчым універсітэтам

Сёлета дыпломы аб вышэйшай адукацыі першай і другой ступені атрымаў 951 выпускнік дзённай формы навучання ГДУ імя Ф. Скарыны, 86 з іх скончылі ўніверсітэт з чырвоным дыпломам.

«Маскоўскі інстытут электроннай тэхнікі». Дадзеная праграма прадугледжвае сумесную падрыхтоўку магістраў і атрыманне дыпломаў двух універсітэтаў. У снежні 2017 года пры Шанхайскім прафесіянальным інстытуце індустрыі, камерцыі і замежных моў быў адкрыты філіял ГДУ імя Ф. Скарыны, на базе якога рэалізоўваецца сумесная падрыхтоўка спецыялістаў па спецыяльнасці «Руская філалогія». З верасня бягучага года пачнецца рэалізацыя сумеснай адукацыйнай праграмы ГДУ імя Ф. Скарыны і Хэцзэскім універсітэтам (Кітай) па падрыхтоўцы спецыялістаў па спецыяльнасці «Фізіка».

— ГДУ імя Ф. Скарыны — гэта і бясспрэчны культурны магніт...

— Ключавую ролю ў жыцці ўніверсітэта выконвае студэнцкі клуб. У ім паспяхова функцыянуюць пяць калектываў са званнем «народны», аматарскія і лакальныя, факультэцкія творчыя аб'яднанні. Штогод ва ўніверсітэце праводзяцца яркія фестывалі, конкурсы, грамадзянска-патрыятычныя мерапрыемствы. Толькі ў мінулым навучальным годзе ўдзельнікі калектываў студэнцкага клуба заваявалі ўзнагароды па выніках міжнароднага шматжанравага фестывалю-конкурсу творчасці Millennium і міжнароднага конкурсу мастацтваў ART motion, сталі лаўрэатамі міжнароднага тэлепраекта «Кубак дружбы» і міжнароднага фестывалю-конкурсу «Прызванне» ў Санкт-Пецярбургу, міжнародных разнажанравых конкурсаў LETOSTAR in Slovenia ў горадзе Залес у Славеніі і Olimpia ў казахстанскім Нур-Султане. І гэта не можа не радаваць, бо, безумоўна, студэнцкія гады — гэта не толькі вучоба, але і бясконцыя станоўчыя эмоцыі і самыя яркія ўспаміны.

Гутарыла Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота ГДУ імя Ф. Скарыны.

Па сутнасці

Тое, што нас аб'ядноўвае

Гэта гімн музычнаму мастацтву і сапраўднаму сяброўству. Гімн Яе Вялікасці Музыцы, што ўзнімае людзей да нябёсаў і лунае нават па-над дзяржаўнымі граніцамі. Ніякая геапалітычная агароджа не спыніць рух аблокаў. Вось і вядомая мелодыя з Віцебска гучыць на ўвесь свет.

Гэта рынгтон, які не старэе. Калі ён гучыць, то зразумела, што ўсё добра. Жыццё працягваецца. Цяпер амаль кожны вечар па тэлевізары або ў інтэрнэце можна чуць пра славянскі свет. Пра тое, як яму пагражае заходняя, захопніцкая цывілізацыя. Яно так. Але ўжо па першых нотах з беларускага горада над Дзвіной зразумела: вось ён — сапраўдны славянскі свет, які дыхае на поўныя грудзі.

І калі дастойныя і праўдзівыя палітычныя высновы не заўжды кранаюць душы людзей, то «парадак дня» фестывалю мастацтваў — найкарацейшы шлях да прымірэння. На палітычнай авансцэне шмат палітыкаў і лідараў грамадскіх думак выказвае свае меркаванні па Украіне. А вось на сцэне з Віцебска гучыць песня. Калі людзі спяваюць песні сваіх суседзяў, гэта і ёсць паразуменне.

Калі «гуманістычная» Еўропа ў чарговы раз пайшла вайной «нах остэн», то нават ад усіх непалітычных ініцыятыў адмовілася. Мо і добра. Бо нават іх прыродныя праграмы, нібыта гіры новага парадку, на нашых нагах. З такім цяжарам далёка не пойдзеш. Толькі ўніз. У дрыгву. А Беларусь — іншае.

Колькі бруду ні вывальвалі б кіеўскія ўлады (зразумела, чаго больш, тым і дзеляцца) на нас, беларусы ўсё роўна з павагай і нават цеплынёй у душы ставяцца да ўкраінскага народа. Да яго культурных набыткаў. Менавіта таму з творчага памоста гучыць традыцыйнае трохмоўнае вітанне.

Як некалі, так і сёння на «Славянскім базары». На гэтых землях некалі магутнага Полацкага княства — крыніцы нашай дзяржаўнасці — па Дзвіне праходзілі значныя гандлёвыя шляхі. А дзе гандаль — там кірмашы. А дзе кірмашы — там песня. Так было, так ёсць, так і будзе. У нашай, той, якую збераглі і маем, Беларусі — заўжды. У гэтым наша краіна пераканала ўвесь свет.

«Славянскі базар» прадэманстраваў яшчэ раз, што не бомбамі і АТА трэба навязваць павагу да мовы, а добрым стаўленнем і павагай. Людзі разумеюць лепш пад музычныя мелодыі, а не свіст куль і снарадаў. Мяне ўразіла кароткае, але яркае відэа. Мой калега па «прапагандысцкім акопе» — расійскі журналіст і блогер — ледзьве стрымаўся, каб не даць гапака пад украінскія спевы. Вось яна, магія мастацтва. Так. Але гэта яшчэ і сведчанне таго, што рускія людзі разумеюць украінскую мову. Калі гэта мова міру.

Прызнаюся. Сэрца кранаюць украінскія песні. Яны вельмі годныя. І хвалюе будучыня суседняй краіны. Усе ведаюць, што канфліктам дырыжыруюць заходнія менеджары. І зразумела, чые рогі тырчаць з гэтай «аркестравай ямы». Таму перамогай будзе не толькі дэнацыфікацыя, але вяртанне ўкраінскага народа за адзіны славянскі стол. І «стол» гучыць сімвалічна. Бо менавіта Беларусь і Расія будуць падкормліваць збяднелы і разрабаваны заходнімі акцыянерамі канфлікту ўкраінскі народ. І вось перамогай будзе, калі, напрыклад, на Хрэшчаціку Дзяніс Майданаў выканае «Ніч яка місячна», а ўкраінскія эстрадныя зоркі — «Ой, мороз, мороз». А «Песнярам» і «Сябрам» аднолькава блізкі ўвесь моўны рэпертуар. Вось гэта і будзе Перамога. «Славянскі базар» развейвае чад братэрскіх непаразуменняў. Дарэчы, так было і раней. Калі пісаць праўду, то і раней, здаралася, стольныя гарады нашых народаў мераліся сіламі, хапалі за чубы адно аднаго. І тады алею ў гэты кіпячы кацёл не саромеліся падліваць заходнія «партнёры» і іншаземныя дарадцы. Але заўжды такое супрацьстаянне заканчвалася мірам. І гандлем. Славянскім базарам.

Я памятаю яшчэ з дзяцінства, як мелодыя «Славянкі» прываблівала да тэлеэкрана ўсю сям'ю. Раней мы не былі такімі разбэшчанымі культурным фаст-фудам. У рацыёне для душы было сапраўднае мастацтва.

За шумам урачыстасці мала хто задумваецца аб сакральнасці гэтага свята мастацтваў. Людзі спявалі песні, калі хацелі выказаць самыя лепшыя пачуцці сэрца і душы. Гэта цяпер Песню запэцкалі шэрым брудам пахабных пастановак. Захад — цывілізацыя еўрабачання (з маленькай літары спецыяльна напісаў). Вы толькі ўдумайцеся, як сімвалічна гучыць: еўрабачанне. Яны ўжо там нікога не чуюць. Толькі пакуль бачаць. І то вочы засцілае туман фэйкаў. А мы цывілізацыя «Славянскага базару». Дзе гучаць песні для душы і з сэнсам. Вось таму нам, беларусам, не соромна за сваё бачанне свету. І, дарэчы, да фестывалю ў Віцебску з аднолькавай павагай ставіцца і культурная багема, і звычайныя меламаны. Бо «Славянскі базар» — як сапраўдны беларус — аб'ядноўвае. І сацыяльныя групы, і народы. Як тая музычная папарадзь-кветка — у пошуках культуры да нас прыязджаюць госці з розных краін.

«Славянскі базар» — яшчэ і адлюстраванне народнай дыпламатыі. Бо ў цяжкі постсавецкі час дзінтэграцыі славянскіх культур і дэмаралізацыі мастацтва з надзеяй загучала: «Гаворыць і паказвае Віцебск». Быў час, калі «Славянскі базар» хацелі «прыхватызаваць». Вывесці з Віцебска і ператварыць у чарговы музычны мас-маркет. Імя захавалі б, а змест змянілі. Так тады дзейнічалі і ў эканоміцы, і ў культуры. На наша багацце, у тым ліку і культурнае, паквапіліся акцыянеры заходняга складу. Не атрымалася. Збіральнікам каштоўнасцяў славянскіх змель выступіў беларускі лідар. Сёння людзі ўдзячныя: не даў украсці свята. Не, шаноўнае спадарства, наш Прэзідэнт тады не даў украсці штосьці большае. Славянскую душу. І Беларусь у гэты нялёгкі час выпрабаванняў працягвае адказваць перад усім светам за Базар. Крыніцу сапраўднага мастацтва.

Яўген ПУСТАВОЙ.

ЗА ПАРОГАМ АДЭКВАТНАСЦІ

Чаму латвійскія ўлады з'ехалі з глузду?

Плюсы такога праекта — можна спрабаваць усё, што цікава, ніхто цябе на спыняе. Мінусы — трэба ўкладваць уласныя рэсурсы і бывае цяжка сябе матываваць на рэгулярную работу.

Тэматычныя групы і канферэнцыі

Ва ўсіх сацыяльных сетках ёсць групы, дзе задаюць пытанні аб SMM. У іх можна знайсці адказы на тыя з іх, у якіх не дапамог пошукавік. Таксама там можна заводзіць знаёмствы з калегамі.

Канферэнцыі — гэта яшчэ адно месца зносін вопытных SMM-спецыялістаў. Там можна знайсці заказчыкаў, даведацца адказы на складаныя пытанні.

Кнігі, артыкулы, вэбінары

Самы просты спосаб вывучыць тэорыю. Анлайн-школы, агенцтвы і сэрвісы для SMM часта вядуць тэматычныя блогі, у якіх можна знайсці асноўную інфармацыю, неабходную будучаму SMM-спецыялісту. Таксама яны праводзяць вэбінары, калі вы любіце відэафармат.

Праводзьце аўдыты

Адзін з карысных навыкаў, які патрэбны SMM-спецыялістам, гэта нагледжанасць. Каб такая з'явілася, трэба праводзіць аўдыты: знаходзіць акаўнты, вывучаць іх, пісаць рэкамендацыі па паляпшэнні. Таксама гэта адзін з самых простых спосабаў знайсці першага кліента.

Цяпер вы ведаеце некалькі спосабаў, як стаць SMM-спецыялістам. Паспрабуйце ўсе — і, магчыма, так вы знойдзеце работу сваёй мары.

Маргарыта САЛОК.

Асабісты вопыт

КОЛЬКІ НАХАДЗІЎ, СТОЛЬКІ І ЗАРАБІЎ

Як працуецца кур'ерам?

Першую такую работу я знайшла, калі мне было сямнаццаць гадоў. Патрэбны быў новы акумулятар для тэлефона. У адной краме са мной пазнаёміўся ўладальнік гандлёвага пункта, які і прапанаваў уладкавацца ў яго кур'ерам. Я згадзілася і адпрацавала год. У далейшым падобныя вакансіі я знаходзіла праз сецівa.

На самай першай рабоце шчыравала ўвечары, таксама быў і дзённы кур'ер, але я з ім амаль не сустракалася. Вазіла акумулятары, гарнітуры і розныя аксесуары для мабільных тэлефонаў. Суседняя інтэрнэт-крама часам давала мне заказы на дастаўку настольных гульняў, плацілі яны менш, чым на асноўнай рабоце, але самі заказы былі прасцейшымі і клиенты больш прыемнымі. Хоць для тэлефонаў рэчы былі лягчэйшыя, настольныя гульні часта даводзілася вазіць у асобным пакеце, што не вельмі зручна.

Праз два гады я дастаўляла ўжо сім-карткі аднаго з мабільных аператараў. Спачатку планавалася веладастаўка, былі і двухколавыя транспартныя сродкі з брэндам кампаніі, але высветлілася, што развозіць заказы кліентам такім чынам вельмі доўга. Таму кур'еры спачатку ехалі з офіса да найбліжэйшай станцыі метро і пакідалі веласіпед там на велапаркоўцы, а далей перамяшчаліся на грамадскім транспарце. Калі былі дастаўкі далей за кальцавую, іх выконвалі гандлёвыя прадстаўнікі. Аператар выдзяляў ім у такіх выпадках аўтамабілі.

Кампанія выдавала нам вопратку з лагатыпам у карпаратыўных колерах — майку, заплечнік прыгожага бірузовага колеру, узімку куртку.

Праз паўгода працавала ўжо ў інтэрнэт-краме, якая прадавала ўсё для тэлефонаў і ноўтбукаў. Таксама запаўняла паперкі для прыёму гаджэтаў у рамонт. Затрымалася на тым месцы больш, чым на год. Там, акрамя маёй, было яшчэ дзве вакансіі кур'ераў, апошнія часта змяняліся, часам за месяц магло звольніцца некалькі чалавек. Я была на той рабоце амаль ветэранам! Пакуль не знаходзілі новага кур'ера, працавалі два замест трох, а заказаў хапала... Ад іх колькасці залежаў наш заробак. «Вандроўкі» са Сцяпянкі на Каменную Горку былі звычайнай справай. Толькі вось калі ў заплечніку пара акумулятараў для ноўтбукаў, пара зарадных да іх жа плюс адмантаваны тэлефон, то гэта вельмі цяжка. Таксама нейкі час я ездзіла на «Еўрапошту» за МКАД, каб адпраўляць пасылкі. Яны амаль ніколі не змяшчаліся ў заплечнік, для іх брала асобны пакет. Таму часта даводзілася перасоўвацца з цяжкім заплечнікам плюс з такім жа пакетам з пасылкамі.

Цяпер я працую ў банку. Там важу на транспарце дакументы з аддзяленняў у галоўны офіс і назад, у розныя арганізацыі. Зрэдку на карпаратыўным таксі, але часцей за ўсё сваім ходам. Акрамя мяне, ёсць яшчэ чатыры кур'еры. Калі нехта захварэў альбо пайшоў у водпуск, іншыя дзеляць яго работу паміж сабой.

Мне падабаецца, што работа кур'ерам дае нейкую свабоду, калі, па сутнасці, ты сам плануеш свой дзень. Часта яе сумяшчаюць з іншай, некаторыя нават паралельна бізнесам умудраюцца займацца. Але гэтая свабода мае іншы бок — часцей за ўсё ў кур'ера здзельная зарплата: колькі нахадзіў, столькі і зарабіў.

Чула ад знаёмых, што яны не змаглі б працаваць кур'ерамі. Гэта дастаткова актыўны занятак, падчас якога патрэбна шмат ездзіць у транспарце і хадзіць пешшу з цяжкім заплечнікам альбо вялікім пакетам. Некаторым складана пераносіць, што яны будуць у адным і тым жа месцы два разы за дзень у розны час. Такое здараецца, але не вельмі часта. Я да гэтага стаўлюся спакойна. Таксама кур'ер павінен умець карыстацца анлайн-карткамі на тэлефоне і ветліва размаўляць з кліентамі.

Бацькі ўжо пачынаюць хвалявацца, што я працую кур'ерам. Ва ўяўленні многіх гэта або падпрацоўка, або часовая работа, або, маўляў, чалавек ні на што лепшае не здольны. Сябры і знаёмыя ніяк не маю работу не рэагуюць. А вось рэакцыя кліентаў — гэта штосьці! Некаторыя, калі я ім тэлефанавала, лічылі, што я менеджар, а не кур'ер. Часам цікавяцца, дзе вучуся, ці асноўная гэта работа, колькі я зарабляю. Ёсць асобная катэгорыя людзей, ва ўяўленні якіх дзяўчына не можа быць кур'ерам. Так здзіўляюцца, калі мяне бачаць! Але ім можа быць амаль любы чалавек. У банку, дзе я цяпер працую, узялі чалавека, які мае аўтызм, і ён выдатна спраўляецца з абавязкамі.

Маргарыта САЛОК, фота аўтара.

МЕНЕДЖАР ГАРДЭРОБУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Часта стылісты кіруюцца мэтай змяніць знешнасць кліента, зрабіць яго больш модным. Яны мяняюць стыль, і, як правіла, робяць гэта з вялікім поспехам. Але ў такім падыходзе ёсць небяспека таго, што кліент не здолее прыняць новы вобраз, ці, што яшчэ горш, гэты вобраз можа не супасці з прыярытэтамі заказчыка і проста не будзе працаваць.

«Для кагосьці чырвоныя штаны — база, а для іншых — атрыбут вячэрняга ўбору. Яшчэ раз падкрэслю, базавая капсула для ўсіх розная, але яна павінна быць ва ўсіх».

— У гэтую прафесію я прыйшла даўно. Усё пачалося ў далёкія студэнцкія гады, калі мой свет у дачыненні да адзення перавярнуўся з ног на галаву. З-за цяжкага жыццёвага перыяду мне прыйшлося шукаць падпрацоўку. Я стала працаваць прадаўцом-кансультантам у краме адзення італьянскага брэнда. Знаходзячыся ў гандлёвым аб'екце, назірала, як пераадзяваюць манекены, як спалучаюць колеры і прынты. Ад усяго гэтага ў мяне гарэлі вочы. І вось да канца пятага курса я станаўлюся візуальным мерчандайзерам, а праз тры месяцы адпраўляюся на месяц у цудоўны горад Сафію на навучанне. У выніку дапрацавалася да кіраўніка крамы, — расказвае суразмоўніца. — Але праз тры гады работы на гэтай пасадзе мне катастрафічна стала не хапаць творчасці ў жыцці. І я вырашыла паспрабаваць сябе ў ролі імідж-стыліста. Адправіўшыся на некалькі шопінгаў, зразумела: з жывымі людзьмі не так усё проста — яны не манекены і далёка не на ўсё згодныя, ва ўсіх ёсць комплексы, стэрэатыпы і г. д. Таму вырашыла развівацца далей у гэтым

кірунку, паспяхова прайшла курсы стылю і ўжо чатыры гады працую імідж-стылістам, радую сваіх кліентаў.

У абавязкі нашай гераіні як імідж-стыліста ўваходзяць розныя паслугі ў залежнасці ад запыту кліента. Асноўнай і нязменнай з'яўляецца кансультацыя, падчас якой адбываецца знаёмства імідж-стыліста з заказчыкам, праводзіцца аналіз, дзейнасці і звычак чалавека, для таго каб зразумець, з якой мэтай ён прыйшоў да спецыяліста. Таксама на кансультацыі імідж-стыліст дае набор асноўных ведаў пра падыходзячыя кліенту адценні колераў і сілуэты, пазней дасылае гэтую ж інфармацыю ў выглядзе пісьмовых рэкамендацый. Наступнай асноўнай паслугай з'яўляецца разбор гардэробу і шопінг-суправаджэнне для яго абнаўлення і стварэння стыльных лукаў. Менш частым запытам пры рабоце з імідж-стылістам з'яўляецца стылізацыя вяселля, дзе спецыяліст цалкам падбірае вобразы маладым і дапамагае з агульнай стылістыкай мерапрыемства, а таксама работа з рознымі кампаніямі і стылізацыя камерцыйных здымак.

— Насамрэч людзі часта скептычна ставяцца да прафесіі імідж-стыліста, абапіраючыся на сцвярджанні «Я сам/сама магу падабраць сабе добрае адзенне», «У мяне добры густ, навошта мне яшчэ стыліст?», «Толькі лішнія выдаткі». Чалавек у момант такіх разважанняў, вядома, не становіцца маім кліентам. Да вызначанага часу. Пакуль яго, як той казаў, «певень не дзеўбануў» ці пакуль яму не падарылі мой сертыфікат. Так, вядома, вы можаце мець выдатны густ, але часта шмат хто знаходзіцца ва ўладзе ўласна складзенага стэрэатыпа пра сябе. Яны ўжо назаўжды вырашылі: гэта мне падыходзіць, а гэта — не. І кропка, — працягвае Наталля. — Лічаць: «ды я лепш сэканомлю і куплю сабе яшчэ адну рэч, чым звярнуся да стыліста». І вось такі «эканаміст» сэканоміў і павесіў сабе ў шафу яшчэ адну непатрэбную рэч. У выніку мы бачым усё тога ж чалавека «без разыначкі»... Нарэшце ён разумее, што бегае па крузе, рэчаў шмат, а надзець няма чаго, і радасці ніякай. Вось тады вам тэрмінова трэба звярнуцца па дапамогу да спецыяліста — гэта дазволіць атрымаць аб'ектыўную прафесійную інфармацыю аб сабе, якасна абнавіць свой гардэроб і не здзейсніць ранейшых памылак.

«Наступнай асноўнай паслугай з'яўляецца разбор гардэробу і шопінг-суправаджэнне для яго абнаўлення і стварэння стыльных лукаў».

Імідж-стыліст можа працаваць як з нейкім канкрэтным чалавекам індывідуальна, так і з цэлай кампаніяй у камерцыйных мэтах. Галоўнае ў пытанні работы, як адзначае наша гераіня, гэта наяўнасць жадання ў кліента, асабліва тое датычыцца індывідуальнай работы. Каб чалавек быў хоць бы крыху настроены памяняць сваё жыццё і ўбачыць у выніку работы новы бок сябе.

— У рабоце з імідж-стылістам існуе яшчэ адзін міф. Быццам мы дапамагаем збіраць толькі базавы гардэроб з чорна-белых адценняў. Так, мы сапраўды даём базу, аснову, з якой нашаму кліенту, пры жаданні, будзе ўжо ў далейшым

«Асноўнай і нязменнай з'яўляецца кансультацыя, падчас якой адбываецца знаёмства імідж-стыліста з заказчыкам, праводзіцца аналіз, дзейнасці і звычак чалавека».

прасцей самому выбіраць сабе адзенне, але не варта забываць, што база для кожнага свая. Гэта залежыць ад прафесіі чалавека, яго рытму і стылю жыцця: для кагосьці чырвоныя штаны — база, а для іншых — атрыбут вячэрняга ўбору. Яшчэ раз падкрэслю, базавая капсула для ўсіх розная, але яна павінна быць ва ўсіх.

Яшчэ адно распаўсюджанае памылковае меркаванне, якое Наталля неаднойчы чула падчас сваёй работы, гэта тое, што быць стыльнымі — дорага. З гэтым наша гераіня не згодная. Бо быць стыльнымі — не значыць адзявацца, як мадэлі з модных паказаў або селебрыці з чырвонай дарожкі. Пры рабоце з кліентамі наша суразмоўніца заўсёды ўлічвае фінансавыя межы, якія чалавек можа дазволіць сабе для куплі адзення, і падбірае модныя лукі ў залежнасці ад матэрыяльных магчымасцяў заказчыка.

— У наш час усё больш людзей, асабліва маладое пакаленне, гоніцца за трэндамі. Вядома, гэта важна і цікава, трэба перыядычна разбаўляць свой гардэроб імі. Але заўжды трэба памятаць, што мы ўсе індывідуальныя і што ўсім да твару розныя рэчы. Не трэба «ўпіхваць» сябе ў тое адзенне, у якім вы адчуваеце сябе некамфортна ці якое перашкаджае вашаму ладу жыцця, толькі таму, што гэта трэнд. У першую чаргу заўсёды заставайцеся самімі сабой, а адукаваны імідж-стыліст вам заўсёды ў гэтым дапаможа і падкрэсліць вашу індывідуальнасць.

Ангеліна НОВІКАВА.
Фота дадзены гераіняй.

СВОЙ СТЫЛЬ

НІОБІЙ ДЛЯ ПІРСІНГУ,

або Універсальнае ўпрыгажэнне

Сёння шмат хто хоча ці ўжо мае пірсінг, таму што мода на яго не знікае колькі сезонаў запар. Наколькі гэта бяспечна, мы даведаліся ў майстра дадзенай сферы Ганны Бадзюковай.

— Пірсінг пачаў цікавіць мяне яшчэ ў падлеткавым узросце. Тады было вельмі модна мець розныя праколы. Многія не хадзілі да майстра і спрабавалі зрабіць іх самі сабе або адзін аднаму, і я не стала выключэннем. Мне спадабаўся вынік і маім сябрам таксама. Многія пачалі звяртацца з просьбамі, і я не адмаўляла. Вынік на іншых таксама атрымліваўся добры: гаенне праходзіла хутка. Тады і зразумела, што павінна развівацца ў гэтай сферы, заняцца ёй прафесіянальна.

Калі вы хочаце зрабіць пракол, то перш за ўсё, па словах нашай суразмоўніцы, трэба вызначыцца, які менавіта від вы жадаеце. Найбольшай папулярнасцю заўсёды карыстаюцца праколы храсткоў і вушных мочак, а таксама крыла носа. Перыядычна ў індустрыі пірсінгу з'яўляюцца трэнды. Так, ужо некалькі гадоў папулярныя праколы перагародкі носа — «септум». Яшчэ ёсць залежнасць ад сезона. Улетку попытам карыстаюцца тыя, што знаходзяцца на вачах: мікрадэрмалы, праколы пупка, плоскасныя праколы і гэтак далей, а зімой — ротавай поласці.

— Неабходна ведаць, што розныя віды праколаў маюць узроставыя абмежаванні, звязаныя з развіццём чалавечага цела. Так, у падлеткавым узросце храсткі дрэнна паддаюцца гаенню і схільныя да розных ускладненняў. Акрамя таго, да пэўнага ўзросту дзеці не здольныя ўсведамляць неабходнасць правільнага догляду і не разумеюць небяспеку з'яўлення ўскладненняў. Я рэкамендую рабіць праколы мочак з чатырнаццаці гадоў, храсткоў з шаснаццаці гадоў, большасць іншых відаў — з пятнаццаці. Акрамя мінімальнага ўзросту, існуе яшчэ і максімальны, але ён для кожнага чалавека індывідуальны. З узростам зніжаецца пругкасць скуры і здольнасць яе да рэгенерацыі. Таксама зніжаецца імунітэт, што ўплывае на гаенне.

Два галоўныя прынцыпы для любых праколаў — чысціня і спакой. Для чысткі ідэальна падыдзе фізіялагічны раствор натрыю хларыду, які лёгка можна прыгатаваць у хатніх умовах. Але адной такой працэдуры ад выдзяленняў будзе недастаткова, калі не забяспечыць спакой. Часцей за ўсё ўскладняюцца праколы, на якіх спяць, якія тузаюць і чапаюць брудныя рукамі.

— Для праколаў часцей за ўсё выкарыстоўваецца адмысловы тытан, які прымяняецца пры пратэзаванні ў медыцыне. Даражэйшы і ідэальна падыходзячы матэрыял — золата. Але з ім не ўсё так проста: у чыстым выглядзе золата не выкарыстоўваецца для вытворчасці ўпрыгажэнняў, таму вельмі важны склад яго прымесяў. Сплаў металу не павінен утрымліваць нікелю. Нават з гэтай прычыны залатая «ювелірка» з крамаў для свежых праколаў не падыдзе, хіба толькі ўпрыгажэнні спецыялізаваных брэндаў. Таксама ў апошні час набірае папулярнасць такі матэрыял, як ніобій, ён таксама цалкам бяспечны для арганізма, сплавы практычна на сто працэнтаў складаюцца толькі з яго самога. Склад упрыгажэння можа выклікаць алергію ў схільных да гэтага людзей. Самы распаўсюджаны алерген — нікель. Ён утрымліваецца, напрыклад, у медыцынскім сплаве і ювелірным золаце.

Многія з тых, хто хочуць зрабіць пірсінг, перажываюць адносна болю. На пытанне кліентаў пра яго наша гераіня адказвае: «Гэта хутка і амаль не адчувальна». Сам пракол робіцца менш, чым за секунду, хоць адчувальнасць у кожнага свая. Нават у аднаго і таго ж чалавека яна на розных участках цела будзе рознай. Але для большасці людзей самыя бязбольныя з'яўляюцца праколы языка, «смайл» (вуздэчка над верхняй губой), мочкі вуха. Таксама Ганна заўважыла наступнае: пры выкананні аднатыпных праколаў запар, другі адчуваецца больш балюча, чым першы.

— Нягледзячы на невялікі боль, я лічу, што анестэзія для пірсінгу не патрабуецца, бо гэта вельмі хуткая і цалкам выносная працэдура. А вось ін'екцыя пад скуру будзе

больш балючая, чым сам пракол. Мне здаецца, што нават аднаго гэтага аргумента павінна быць дастаткова, каб адмовіцца ад яе. Разнастайныя абязбольвальныя спрэі і мазі дзейнічаюць вельмі павярхоўна і не могуць абязбаліць пракол. Больш за тое, анестэзія не зусім бяспечная. Прэпарат можа выклікаць алергічную рэакцыю рознай ступені цяжкасці, аж да анафілактычнага шоку, або негатыўна адбіцца на гаенні.

На заканчэнне нашай гутаркі суразмоўніца падкрэсліла, што, нягледзячы на модныя тэндэнцыі, рашэнне — рабіць пірсінг ці не — павінна быць свядомым і асабістым, а не абумоўленым староннімі фактарамі. Але тое, што пірсінг — універсальнае ўпрыгажэнне, якое ў сучасным свеце падыходзіць абсалютна ўсім, яна цалкам упэўненая.

Мілана МІХАЙЛАВА,
выпускніца 7 класа СШ № 36 г. Мінска.
Фота дадзены гераіняй.

SEX=БАЛЯСЫ

ВЯСЕЛЛЯ ЧАС І ЧАС РАССТАННЯ...

Шлюбная цырымонія — для многіх знамянальная падзея, да якой старанна рыхтуюцца ў прадчуванні асаблівых эмоцый. Вось толькі апошнія могуць быць рознымі... («— Скажыце, у вас з жонкай заключаны шлюбны кантракт? — Я назваў бы яго дагаворам аб ненападзенні».) Так, у Багдадзе мясцовы загс ужо паспеў зарэгістраваць самы хуткі развод з пачатку года: жаніх афіцыйна парваў з нявестай проста падчас урачыстасці. («Быў на вяселлі. Гулялі весела і добра. Толькі стаміўся вельмі! Больш жаніцца не буду!») Уся справа была ў... песні. Калі афіцыйная частка прайшла і пачаўся час для віншаванняў і выступленняў, на сцэну выйшла нявеста.

Відаць, дзяўчына адразу вырашыла паказаць, што цяпер, калі шлюб ужо заключаны, у доме гаспадыняй будзе менавіта яна. («Самае галоўнае ў спрэчцы з жонкай — перацягнуць на свой бок цешчу».) Таму яна станцавала пад песню спявачкі з Сірыі Ламіс Кан Mesaytara, якая перакладаецца літаральна як «Я даміную». («Я магу ўсе». — «Гэта прапанова?» — «Гэта папярэджанне».) Але жаніх і яго сям'я, відаць, не падзялялі ідэі матрыярхату, і ўспрынялі выступленне нявесты як правакацыю. Муж тут жа звярнуўся ў адміністрацыю, каб скасаваць шлюб як мага хутчэй. Што было ў песні? Вось яе фрагмент: «Я даміную, і ты будзеш жыць па маіх жорсткіх інструкцыях, я кіну цябе, варта табе заглядзецца на іншую дзяўчыну на вуліцы, так, любы, я буду кантраляваць цябе ва ўсім, пакуль ты са мной, ты жывеш па маіх правілах — я цябе папярэдзіла». («З размовы пары: — «Дарагі, сфатаграфуй мяне, калі ласка, з кветкамі...» — «Добра, давай. Дзе кветкі?» — «Гэта я хацела спытаць: «Дзе кветкі?»)

А вось іншая гісторыя. Маці жаніха з першай сустрэчы неўзлюбіла будучую нявестку і вырашыла ўсімі сіламі разладзіць вяселле. Для гэтага жыхарка Вялікабрытаніі склала вясельныя запрашэнні, у якіх клікала гасцей на мерапрыемства «са шкадаваннем». Акрамя таго, у лістах нявеста стала «валацугай». («— Ну, Сцёп, ты ж ведаеш, што ў разводзе заўсёды вінаватыя абое...» — «Ага, яна і яе маці!») Многія палічылі, што гэта жарт, аднак знайшліся і тыя, хто меркаваў, што за такім учынкам крыецца схаванае абурэнне. У запрашэнні сказана: «Са шкадаваннем запрашаю вас на вяселле паміж маім выдатным сынам, Доктарам, і нейкай Таннай Валацугай, чыё імя не ўспамінаецца мне проста цяпер. Для мяне гэты дзень стане самай вялікай катастрофай у жыцці». («— А сукенка ў цябе не вельмі!» — сказала свякроў у дзень вяселля. — «Нічога, у наступны раз будзе лепшай», — адказала нявестка».)

А як вам такое? Сведка на вяселлі прыняў стаўкі на... развод пары і быў аблаяны ў сетцы. Карыстальнік Reddit пад нікам WeddingBetMistake распавёў, што, карыстаючыся магчымасцю сказаць доўгі тост як шафер, ён падчас свайго выступлення прапанаваў гасцям згуляць у таталізатар. Удзельнікі павінны былі назваць меркаваны год разводу пары. Мінімальная стаўка склала 50 долараў. («— Сёма, колькі б ты даў за маю жонку?» — «За Соню?» — «Так!» — «Нічога!» — Такі дамовіліся, забірай!») Той, чыя здагадка ў будучыні аказалася б дакладнай, змог бы атрымаць увесь прызавы фонд. Маладому чалавеку ўдалося сабраць з гасцей тры тысячы долараў. Растлумачыўшы правілы, шафер меў намер на заканчэнне паведаміць, што ніхто ніколі не выйграе, а маладыя сарвуць джэкпот. «Вы двое будзеце разам назаўжды, так што вы можаце разлічваць на атрыманне прыбытку ў 2041 годзе!» — пераказаў ён прыдуманы фінал. («— Чаму вы бераце на работу толькі жанатых?» — «Таму што яны прывыклі да абраз і не спяшаюцца дадому».) Аднак дагаварыць яму не дазволілі: нявеста расплакалася, жаніх раз'юшыўся, а практычна ўсе госці сталі крычаць на яго. Пазней жаніх паведаміў аўтару паста, што яго каханая адчувае сябе ўдзячнай усім, хто зрабіў стаўкі. («Дрэнным тонам было ў працэсе знаёмства гасцей на вяселлі сказаць: «Вы з боку пацярпелага?») А большасць падпісчыкаў сышлася на думцы, што нават згадваць слова «развод» на вяселлі непрыстойна. «Літаральна сапсаваў увесь дзень», — заключылі яны. («У загсе Валера нават і не падазраваў, што надзявае на безыменны палец будучую каронку на сёмы ніжні».)

А нейкі час таму ў Гомелі — не, не само вяселле, а адзін з яго атрыбутаў адыграў фатальную ролю ў начным злачынстве дзяўчыны. У адной з забаўляльных устаноў праходзіла вечарынка ў стылі «дзявочнік». («Сустракаючы класам світанак, выпускнікі нават не падазравалі, што правядуць разам яшчэ 15 сутак».) На працягу ўсёй ночы для дзяўчат у вэлюме ўваход быў бясплатны. Як высветлілася пазней, скарысталася гэтай прапановай толькі 34-гадовая гамяльчанка. («— А як я пазнаю вас на першым спатканні?» — «Я буду ў вэлюме і з рэчамі».) У разгар мерапрыемства адна з наведвальніц начной установы звярнулася па дапамогу да адміністратара клуба і аховы — з яе сумачкі прапалі грошы. («Вяртацца — дрэнная прыкмета. Асабліва калі ты замужам і прайшло ўжо тры дні».) Супрацоўнікі міліцыі хутка ўстанавілі падазраваную. Ёю была адзіная ва ўстанове ўладальніца аксесуара нявесты. Даме ў вэлюме — выхавальніцы дзіцячага садка — прыйшлося расстацца з украдзенымі грашыма. Але была заведзена крымінальная справа. Уявіце, што фігурантка справы — чыясьці жонка?.. (« — Ты чаму ў мяне такая дурніца неадэкватная? — «Таму што так табе і трэба!»)

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«Пасля стартаў хочацца больш трэніравацца, каб менш прайграваць»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

«У лыжах трэба выціскаць з сябе максімум, а ў біятлоне самае галоўнае — трапіць у мішэнь. Трэба і бегчы, і страляць, вельмі цікава».

Да спартыўных вышынь яго вядзе Васіль Гаўруковіч. Заслужаны трэнер працуе ў Магілёўскай абласной СДЮШАР прафсаюзаў «Спартак», дзе адкрыта адзінае ў краіне аддзяленне інваспорту па лыжных гонках. Часам трэнер ездзіць да Уладзіслава ў Шклоў, а часам — спартсмен прыязджае ў Магілёў. Умовы для трэніровак і безбар'ернае асяроддзе і ў Шклове, і ў Магілёве дазваляюць плённа працаваць.

У арсенале Уладзіслава розныя дыстанцыі — спрынт (800 метраў), 5, 10 і 18 кіламетраў. Спартсмен сцвярджае, што лыжнік павінен умець усё, але для гэтага трэба падабраць спецыяльныя трэніроўкі. «Трэнер распрацоўвае мне такі план, каб я мог бегаць усе дыстанцыі. Калі рабіць толькі хуткасныя, то на доўгія сіл хапаць не будзе. А калі рабіць раўнамерныя трэніроўкі па дзве-дзве з паловай гадзіны, то сілы будуць і на спрынт, і на доўгія дыстанцыі. Мне больш падабаюцца доўгія і сярэднія. На спрынце мне яшчэ не хапае вопыту. Там адну памылку зрабіў — і ўсё, адна мілісекунда можа прывесці да пройгрышу. На спаборніцтвах у Ханты-Мансійску я быў чацвёртым, прайграўшы трэцяму месцу 21 мілісекунду. І вось у такія моманты разумееш, што недзе недапрацаваў на трэніроўцы, штосьці ўпусціў», — тлумачыць ён.

«Мне вельмі падабаюцца хуткасныя трэніроўкі. Спачатку траса ў Раўбічах здалася вельмі цяжкай. А потым прывык, ужо хочацца большай хуткасці».

Акрамя лыжных гонак, Уладзіслаў Кандратаў выступае ў біятлоне. Праўда, пакуль з гэтым ёсць цяжкасці — няма вінтоўкі. А які ж біятлон без яе! «У біятлоне мне не хапае вопыту ў стральбе. Я не трапляю па мішэні, пачынаю нервавацца. Але біятлон мне больш падабаецца. У лыжах ты проста едзеш на хуткасць, а ў біятлоне можна легчы і пастраляць, і гонка больш спакойная. У лыжах трэба выціскаць з сябе максімум, а ў біятлоне самае галоўнае — трапіць у мішэнь. Трэба і бегчы, і страляць, вельмі цікава», — расказвае спартсмен.

Сёлета Уладзіслаў павінен быў выступаць на самых важных стартах у сваёй кар'еры — Паралімпійскіх гульнях у Пекіне. Але, як вядома, беларускіх і расійскіх спартсменаў адхілілі ад удзелу ў іх. «У Пекіне маёй асноўнай задачай было набрацца вопыту. Мы не разлічвалі на высокія месцы, бо я толькі два гады трэніраваўся. Але тое, што за гэты час змог адабрацца на Паралімпійскія гульні — ужо поспех. Калі мне паведамілі, што буду ўдзельнічаць у Гульнях, я быў вельмі шчаслівы. Але ўжо ў Пекіне сказалі, што выступаць мы не будзем...»

Разам з беларускай камандай Уладзіслаў Кандратаў удзельнічаў у альтэрнатыўных спаборніцтвах «Мы разам. Спорт», якія прайшлі ў Ханты-Мансійску. Па словах спартсмена, выступаць на турнірах у Беларусі ці ў Расіі прасцей — свая мова, знаёмая культура. «Аднак калі я быў на спаборніцтвах у Нарвегіі і Фінляндыі, мне было цікава ўбачыць узровень турніраў. Пасля стартаў хочацца больш трэніравацца, каб менш прайграваць», — заўважае ён.

Сезон у лыжнікаў пачынаецца летам. Таму цяпер Уладзіслаў праходзіць вучэбна-трэніровачны збор у Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па лыжных відах спорту «Раўбічы». У плане на дзень — па дзве трэніроўкі. «Мне вельмі падабаюцца хуткасныя трэніроўкі. Спачатку траса ў Раўбічах здалася вельмі цяжкай. А потым прывык, ужо хочацца большай хуткасці. Ад летняй падрыхтоўкі многае залежыць. Як летам папрацуеш, такі зімой і вынік будзе», — разважае спартсмен.

У пачатку вясны ў лыжнікаў заканчваюцца спаборніцтвы, затым — адпачынак і аднаўленне, а летам зноў «у бой». Сёлета вясной Уладзіслаў месяц «адпачываў» у бальніцы — яму рабілі пратэзы. «Цяпер мне зрабілі пратэзы са сваім каленам, і па доме я ўжо магу хадзіць без мыліц, без кійка. На вуліцы — толькі па роўнай паверхні, бо калі трапіць нейкі каменьчык, могуць узнікнуць цяжкасці. На пратэзы цяжкавата ўстаць, але калі хочаш хадзіць — будзеш хадзіць. У нас вельмі добрая каманда, старэйшыя спартсмены дапамагаюць, падтрымліваюць. Я з усімі добрыя адносіны наладзіў, бо я камунікабельны хлопец. Але куміраў у мяне няма. Кожны спартсмен па-свойму моцны. І раўняцца на кагосьці не варта, трэба імкнуцца самому быць лепшым».

«Акрамя лыжных гонак, Уладзіслаў Кандратаў выступае ў біятлоне. Праўда, пакуль з гэтым ёсць цяжкасці».

Між іншым, спорт — не адзіны занятак у жыцці Уладзіслава. Хлопец мае спецыяльнасць апаратара электронна-вылічальных машын, па якой ён плануе працаваць. «Вядома, спорт я не кіну, буду сумяшчаць. Думаю, спраўлюся. Спецыяльнасць у мяне перспектыўная, цікавая. І калі добра працаваць, можна добра зарабляць. Мне заўсёды былі цікавыя камп'ютары. Калі яшчэ быў на нагах, то вучыўся не вельмі добра. Але потым зразумеў, што вучыцца трэба».

Спартсмен сцвярджае, што лыжнік павінен умець усё, але для гэтага трэба падабраць спецыяльныя трэніроўкі.

Аднак галоўная мэта Уладзіслава — спартыўная. І гэта, зразумела, перамога на Паралімпійскіх гульнях. «Дзеля таго і трэніруюся. А там будуць новыя мэты», — канстатуе ён.

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота дадзены героем.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
E-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, праск. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 20.07.2022 г.

Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, просп. Победителей, 29

Форма 1

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 30 июня 2022 г.

Наименование банка ОАО «Банк БелВЭБ»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	на 30.06.2022	на 31.12.2021
1	2	3	4	5
1	АКТИВЫ			
2	Денежные средства	1101	91 760	63 583
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	488 864	517 843
5	Средства в банках	1104	291 192	680 692
6	Ценные бумаги	1105	736 717	806 406
7	Кредиты клиентам	1106	2 264 805	2 734 973
8	Производные финансовые активы	1107	8 401	2 739
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	13 493	13 493
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	118 157	117 248
11	Доходные вложения в материальные активы	1110	2 069	5
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111	2 516	1 196
13	Отложенные налоговые активы	1112	8	8
14	Прочие активы	1113	56 068	63 885
15	ИТОГО активы	11	4 074 050	5 002 071
16	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
17	Средства Национального банка	1201	47	37 478
18	Средства банков	1202	1 194 625	1 677 029
19	Средства клиентов	1203	2 162 447	2 507 767
20	Ценные бумаги банка	1204	119 047	113 046
21	Производные финансовые обязательства	1205	-	255
22	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
23	Прочие обязательства	1207	25 286	35 670
24	ВСЕГО обязательства	120	3 501 452	4 371 245
25	СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
26	Уставный фонд	1211	117 408	117 408
27	Эмиссионный доход	1212	-	-
28	Резервный фонд	1213	77 254	77 254
29	Фонды переоценки статей баланса	1214	(86 059)	(10 636)
30	Накопленная прибыль	1215	463 995	446 800
31	ВСЕГО собственный капитал	121	572 598	630 826
32	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	4 074 050	5 002 071

Форма 2

ОТЧЕТ
О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
за 6 месяцев 2022 года

Наименование банка ОАО «Банк БелВЭБ»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	за 6 месяцев 2022 года	за 6 месяцев 2021 года
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	193 921	154 819
2	Процентные расходы	2012	146 035	65 394
3	Чистые процентные доходы	201	47 886	89 425
4	Комиссионные доходы	2021	45 701	55 591
5	Комиссионные расходы	2022	17 232	23 597
6	Чистые комиссионные доходы	202	28 469	31 994
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	68	(196)
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	(409)	(4 672)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	(7 367)	3 487
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	5 596	9 047
11	Чистые отчисления в резервы	207	(17 448)	32 521
12	Прочие доходы	208	2 801	3 775
13	Операционные расходы	209	70 572	75 579
14	Прочие расходы	210	3 185	3 405
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	20 735	21 355
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	3 811	4 823
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	16 924	16 532

Председатель Правления банка В.С. Матюшевский

Главный бухгалтер – директор департамента бухгалтерского учета и налогообложения О.С. Турбина

Дата подписания: 11 июля 2022 г.

Бухгалтерская (финансовая) отчетность размещена на сайте www.belveb.by в разделе «О банке / Раскрытие информации / Отчетность / Отчетность в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь / Квартальная отчетность за 2022 год».

ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 21.12.2018 № 6. УНП 100010078.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ

Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП»
16 августа 2022 в 14.00 проводит повторные торги по продаже следующих объектов

ЛОТ № 1: КОМПЛЕКС ИМУЩЕСТВА В СОСТАВЕ:

№ п/п	Наименование	Наименование основных средств	Инвентарный номер	Дата ввода в эксплуатацию
1	Недвижимое улучшение: капитальное строение с инвентарным номером 730/С-184, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание заводоуправления с пристройкой, общей площадью 2571,5 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Кричевский район, г. Кричев, ул. Зеленая. В том числе:	,		
	Здание заводоуправления	Здание заводоуправления, инв. № кап. стр. 730/С-184, г. Кричев, ул. Зеленая	00110077	Декабрь 1948 года
2	Пристройка к зданию заводоуправления	Пристройка к зданию заводоуправления, инв. № кап. стр. 730/С-184, г. Кричев	00110088	Март 1986 года
3	Насаждения ограниченного пользования, расположенные по адресу: Могилевская обл., Кричевский район, г. Кричев, ул. Зеленая. (Зеленые насаждения (туи, кустарники, деревья))	Насаждения ограниченного пользования	00970243	Июль 2010 года

Начальная цена продажи лота № 1 снижена на 40 % и с учетом НДС (20 %) составляет 294 624,00 (Двести девяносто четыре тысячи шестьсот двадцать четыре белорусских рубля 00 копеек), задаток 29 462,40 бел. руб. (Двадцать девять тысяч четыреста шестьдесят два белорусских рубля 40 копеек.)

ЛОТ № 2: КОМПЛЕКС ИМУЩЕСТВА В СОСТАВЕ:

№ п/п	Наименование	Наименование основных средств	Инвентарный номер	Дата ввода в эксплуатацию
1	2		3	4
1	Недвижимое улучшение: капитальное строение с инвентарным номером 730/С-303, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание овощехранилища, общей площадью 32,1 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Кричевский район, г. Кричев, ул. Зеленая	Здание овощехранилища, инв. № кап. стр. 730/104-9283, г. Кричев	00110111	Август 2004
2	Недвижимое улучшение: капитальное строение с инвентарным номером 730/С-12784, назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – здание столовой, общей площадью 1329,1 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Кричевский район, г. Кричев, ул. Зеленая	Здание столовой, инв. № кап. стр. 730/104-9290, г. Кричев, ул. Зеленая, д. 4	00110080	Ноябрь 1981
3	Недвижимое улучшение: капитальное строение с инвентарным номером 730/С-13142, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – ограждение столовой декоративное металлическое, общей протяженностью 38 м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Кричевский район, г. Кричев, ул. Зеленая, д. 4	Ограждение столовой декоративное металлическое, 730/С-13142	00220159	Декабрь 2007
4	Недвижимое улучшение: капитальное строение с инвентарным номером 730/С-13334, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – ограждение столовой, общей протяженностью 64,1 м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Кричевский район, г. Кричев, ул. Зеленая, д. 4. В том числе:			
	Ограждение столовой (ж/б)	Ограждение столовой (ж/б), инв. № кап. стр. 730/С-13334, г. Кричев	220082-1	Август 2004
5	Ограждение столовой	Ограждение столовой, инв. № кап. стр. 730/С-13334)	00220082	Август 2004
6	Недвижимое улучшение: капитальное строение с инвентарным номером 730/С-13143, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – ограждение столовой ж/б декоративное, общей протяженностью 105 м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Кричевский район, г. Кричев, ул. Зеленая, д. 4	Ограждение столовой ж/б декоративное, инв. № кап. стр. 730/С-13143	00220158	Декабрь 2007
7	Насаждения ограниченного пользования, расположенные по адресу: Могилевская обл., Кричевский район, г. Кричев, ул. Зеленая	Насаждения ограниченного пользования	00970245	Июль 2010
8	Печь ротационная (хлебопечка), 1996 года выпуска	Печь ротационная (хлебопечка)	00440673	Январь 1999
9	Плита электрическая промышленная ПЭМ4-010, 2009 года выпуска	Плита электрическая промышл. ПЭМ4-010	00445053	Сентябрь 2009
10	Плита электрическая промышленная ПЭМ4-010, 2009 года выпуска	Плита электрическая промышл. ПЭМ4-010	00445054	Сентябрь 2009
11	Плита электрическая промышленная ПЭМ4-010, 2009 года выпуска	Плита электрическая промышл. ПЭМ4-010	00445058	Октябрь 2009
12	Прилавок нейтральный открытый, 2 полки, ПН-78К, 1500х1000х1400, 2014 года выпуска	Прилавок нейтральный открытый, 2 полки, ПН-78К, 1500х1000х1400	00461402	Август 2014
13	Прилавок холодильный, 2 полки, ПВВ(Н)-84К-1, 1500х1000х1400, 2014 года выпуска	Прилавок холодильный, 2 полки, ПВВ(Н)-84К-1, 1500Х1000Х1400	00460189	Июнь 2014
14	СПЛИТ KLS 218, 2012 года выпуска	СПЛИТ KLS 218	00445502	Август 2012
15	СПЛИТ KLS 220, 2012 года выпуска	СПЛИТ KLS 220	00445503	Май 2012
16	СПЛИТ KMS 107, 2012 года выпуска	СПЛИТ KMS 107	00445501	Май 2012
17	СПЛИТ KMS 120, 2012 года выпуска	СПЛИТ KMS 120	00445500	Август 2012
18	Стойка для приборов и подносов ПСПиП-1, 560х700х1130, 2014 года выпуска	Стойка для приборов и подносов ПСПиП-1560х700х1130	00461404	Август 2014

Начальная цена продажи лота № 2 снижена на 40 % и с учетом НДС (20 %) составляет 170 704,80 (Сто семьдесят тысяч семьсот четыре белорусских рубля 80 копеек), задаток 17 070,48 бел. руб. (Семнадцать тысяч семьдесят белорусских рублей 48 копеек.)

Собственник имущества: Открытое акционерное общество «Кричевцементношифер», 213493, Республика Беларусь, Могилевская область, Кричевский р-н, Краснобудский с/с, 2, АБК в районе месторождения «Каменка», тел. +375224120909, тел. для осмотра объектов продажи +375224120914.

Организатор торгов: Унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1.

Место проведения торгов: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лоты №№ 1–2 продаются без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, представившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Задаток перечисляется на расчетный счет унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП» р/с № BY55PJCB30123018571000000933 в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ 300 г. Могилев, BIC: PJCBBY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет-сайте продавца по адресу: www.mogilevcci.by.

Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) – в течение 10 календарных дней после проведения торгов.

Срок оплаты предметов торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

Торги состоятся 16 августа 2022 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 104. Последний срок подачи заявления – 15 августа 2022 до 12.00.

Регистрация участников торгов 16 августа 2022 с 13.30 до 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефоны для справок:
(0222) 778042, +375 0296927492 (А1).

Дополнительная информация размещена на сайте организатора.

Извещение о предыдущих торгах по объектам было размещено в газете «Звязда» от 25.05.2022.

ЗАО «БелБанкротАукцион», организатор торгов по продаже имущества
ОАО «Телеханский завод столярных изделий» (УНП 200099487), объявляет о проведении **05.08.2022 г.** в 09.00 публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by

Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2022/07/spisok-imushhestva-telehanskij-zsi.pdf

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375(29) 254-53-88.

Продавец: ОАО «Телеханский завод столярных изделий».

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее **04.08.2022 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 **21.07.22** по 17.00 **04.08.22** организатором торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

